ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 28 (307) | Субота, 21 кастрычніка 1978 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## МАБІЛІЗУЮЧЫЯ ЗАКЛІКІ ПАРТЫІ

Савецкі народ, усё прагрэсіўнае чалавецтва ; рыхтуюцца
дастойна сустрэць інтэрнацыянальнае свята — 61-ю гадавіну
Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Па доб-
рай традыцыі напярэдадні гэтай светлай даты ленінская пар-
тыя звяртаецца да савецкіх людзей з палымянымі Заклікамі
ЦК КПСС.

З асаблівым настроем сустракае свята Кастрычніка беларускі народ. Ён рыхтуе дастойную сустрэчу 60-гадоваму юбілею сваёй рэспублікі, Камуністычнай партыі Беларусі. Аглядваючыся на пройдзены рэспублікай шлях, азораны велічнымі ідэямі Леніна, беларускі народ з асаблівай радасцю пачуццямі гонару можа гаварыць аб тых велічных змяненнях, якія адбыліся за гады Савецкай улады ў Беларусі. Усяму свету вядомы сёння беларускія трактары і самазвалы, станкі і ЭВМ. Вялікія дасягненні нашай рэспублікі ў навуцы, у культуры. Беларускі народ, як і ўсе савецкія людзі, настойліва працуе над выкананнем планаў і абавязацельстваў трэцяга года пяцігодкі. Самы гарачы водгук знаходзіць у нашых сэрцах баявы заклік:

**— Працоўныя Савецкага Саюза! Змагайцеся за ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, імкніцеся поўнасцю рэалізаваць магчымасці развітога сацыялізму!**

Вялікая роля ў выкананні велічных планаў партыі і народа адводзіцца моладзі і яе амаль 38-мільённаму авангарду — камсамолу.

«У цэлым камуністы старэйшага пакалення могуць, я думаю, быць задаволены савецкай моладдзю нашых дзён, — гаварыў на XVIII з'ездзе ВЛКСМ таварыш Л. І. Брэжнеў. — Яна расце камуністычна перакананай, глыбока адданай справе партыі, справе вялікага Леніна. Мільёны юнакоў і дзяўчат паказваюць узоры мужнасці, стойкасці, вернасці ідэалам Кастрычніка».

Высокую ацэнку сваёй дзейнасці камсамол, савецкая моладзь апраўдвае выдатнай вучобай, ударнай працай. Напярэдадні 60-годдзя Ленінскага камсамола камсамольцы ГДУ асабліва плённа папрацавалі на будаўнічых аб'ектах, на палетках калгасаў і саўгасаў у саставе СБА, упершыню створанага ва універсітэце студэнцкага механізаванага атрада ў час трэцяга, працоўнага семестра. З найлепшага боку зарэкамендавалі яны сябе і на ўборцы бульбы. Ідучы насустрач свайму 60-гадоваму юбілею, камсамольцы універсітэта, як і ўся моладзь Краіны Саветаў, даюць слова быць заўсёды ў першых радах будаўнікоў камунізму, свята выканаць наказ партыі, які ўтрымліваецца ў палымяных радках Заклікаў:

**— Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце ведамі, выхоўвайце ў сабе высокую ідэйнасць! Вучыцеся жыць, працаваць і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму!**

Трэба дабівацца таго, каб значна павысіць якасць вучобы, яшчэ больш прывіць кожнаму юнаку і дзяўчыне любоў да працы і кожны дзень напоўніць цікавымі і карыснымі справамі.

Камуністычная партыя заўсёды высока цаніла і цэніць той велізарны ўклад, які ўносяць у развіццё перадавой у свеце савецкай навукі нашы вучоныя, іх самаадданую працу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. З аптымізмам і ўпэўненасцю гучаць словы Заклікаў, звернутыя да людзей творчай думкі:

**— Савецкія вучоныя! Павышайце эфектыўнасць навуковых даследаванняў, умацоўвайце сувязь навукі з вытворчасцю!**

**Слава савецкай навуцы!**

Канкрэтныя задачы ў Закліках ЦК КПСС пастаўлены таксама перад работнікамі ўсіх галін народнай гаспадаркі, дзеячамі літаратуры і мастацтва, воінамі Савецкай Арміі. Ганаровы абавязак кожнага — унесці пасільны ўклад у выкананне пастаўленых адказных задач.

Напярэдадні свята ЦК КПСС звяртаецца да народаў свету з гарачым заклікам памножыць свае намаганні ў барацьбе за ліквідацыю пагрозы новай сусветнай вайны, паглыбленне разрадкі міжнароднай напружанасці.

Поўны творчых сіл, цесна згуртаваны вакол Камуністычнай партыі сустракае савецкі народ 61-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. Пад кіраўніцтвам КПСС мы смела крочым у заўтрашні дзень і з пачуццём любві і ўдзячнасці да арганізатара ўсіх нашых перамог гаворым:

**— Няхай жыве Ленінская Камуністычная партыя Савецкага Саюза — натхніцель і арганізатар перамаганоснай Кастрычніцкай рэвалюцыі, кіруючая і накіроўваючая сіла савецкага грамадства!**

**— Няхай жыве наша вялікая Радзіма — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!**

## У ВУЧОБЕ І ПРАЦЫ

На кожным факультэце на-
шага універсітэта распрацаваны
графікі правядзення Усесаюзна-
га камсамольскага сходу, пра-
дугледжаны ўсе меры, каб ён
праходзіў на высокім арганіза-
цыйным і палітычным узроўні.
Аднымі з першых ва універсі-
тэце і на матэматычным фа-
культэце правялі Усесаюзны
камсамольскі сход студэнты
групы М-31. З добрымі паказ-
чыкамі ў вучобе, працы, гра-
мадскім жыцці сустракаюць на-
дыходзячае свята — 60-гадовы
юбілей Ленінскага камсамола—
юнакі і дзяўчаты названай гру-
пы. Добра вучыцца, стаць вы-
сокакваліфікаваным спецыяліс-
там — вось галоўная задача
кожнага студэнта. Гэта выдатна
разумеюць камсамольцы групы
Уладзімір Цішкевіч, Надзея
Драгунова, Галіна Тодарава,
Вера Манянкова, Таццяна Ярма-
ліцкая.

У тым, што па выніках трэ-
цяга, працоўнага семестра гэта-
га года зводны студэнцкі бу-
даўнічы атрад універсітэта вый-
шаў пераможцам у Гомельскай
вобласці і заваяваў Пераходны
Чырвоны сцяг абласной кам-
самольскай арганізацыі за ак-
тыўны ўдзел у студэнцкім бу-
даўнічым руху, немалая заслу-
га і камсамольцаў-трэцякурсні-
каў матэматычнага факультэта.
У саставе СБА «Алеся» дзяўча-
ты з групы М-31 Валянціна Ка-
надо, Марыя Кубышкіна, Люда
Кацуба, Вольга Гарэлава і ін-
шыя выязджалі на сельскагас-
падарчыя работы ў сонечную
Малдавію. Ва універсітэт яны
прывезлі граматы і вымпелы,
якімі кіраўніцтва калгаса імя
XX партз'езда і Слабадзейскі
РК ЛКСМ Малдавіі ўзнагародзі-
лі дзяўчат за выдатную працу.

На сходзе выступілі камсорг
групы Н. Старжынская, адказ-
ныя за работу акадэмічнага сек-
тара, правядзенне палітінфарма-
цый В. Манянкова і А. Цішке-
віч, актыўная ўдзельніца будат-
радаўскага руху В. Канадо.
Камсамольцы прынялі мерапры-
емствы па дастойнай сустрэчы
60-годдзя БССР і КПБ.

## АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД

18 кастрычніка ў актавай зале адбыўся агульнауніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход. Заслухана і абмеркавана справаздача партыйнага камітэта ГДУ па дакладу сакратара парткома **У. В. Казлова**.

У спрэчках па дакладу выступілі: прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар **Л. А. Шамяткоў**, загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт **М. М. Маёраў**, загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, старшыня камісіі парткома па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі прафесар **Ф. М. Харытановіч**, дэкан фізічнага факультэта дацэнт **У. Я. Мацюшэнка**, студэнт эканамічнага факультэта **У. В. Зарэцкі**, сакратар партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта **А. К. Няронская**, выкладчык кафедры гісторыі КПСС, дырэктар філіяла універсітэта марксізму-ленінізму **У. А. Сізоненка**, намеснік сакратара камітэта ЛКСМБ **М. А. Беразоўская**, сакратар партбюро матэматычнага факультэта **Л. Я. Палякоў**, старшыня мясцкома **М. У. Акуліч**, старшы выкладчык факультэта фізвыхавання камандзір механізаванага атрада **В. І. Селіванаў**, рэктар універсітэта член-карэспандэнт АН БССР, прафесар **Б. В. Бокуць**.

Партыйны сход прызнаў работу парткома за справаздачны перыяд здавальняючай і прыняў адпаведную пастанову.

На справаздачным сходзе выбраны новы састаў парткома і дэлегаты на XXII раённую справаздачна - выбарную партыйную канферэнцыю Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

Выбраны новы састаў камісіі парткома па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі.

У рабоце агульнауніверсітэцкага справаздачна-выбарнага партыйнага сходу прынялі ўдзел інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **П. П. Прахарэнка**, сакратар абкома КПБ **С. П. Бабыр**, які выступіў з прамовай, першы сакратар Цэнтральнага райкома КПБ **А. М. Кускова**.

* * *

Адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага саставу партыйнага камітэта. Яго сакратаром выбраны **І. Ф. Эсмантовіч**.

## САСТАЎ ПАРТКОМА

АНІЧЭНКА У. В. — загадчык кафедры беларускай мовы.

АРЭШЧАНКА У. Д. — загадчык кафедры эканомікі працы.

БОКУЦЬ Б. В. — рэктар універсітэта.

КАЛМЫКОЎ У. М. — загадчык кафедры філасофіі.

КОЛТЫШАВА Н. І. — старшыня прафкома.

ЛАЗАРАЎ І. С. — в. а. дацэнта кафедры агульнай геалогіі.

МАЦЮШЭНКА У. Я. — дэкан фізічнага факультэта.

САНЬКОВА Л. У. — студэнтка 2-га курса эканамічнага факультэта.

САФОНАЎ С. А. — дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.

СЕМЯНЧУК Я. А. — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

СТАРАВОЙТАЎ М. І. — асістэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі.

СІСЬКОЎ В. І. — загадчык кафедры спартыўных дысцыплін.

ТРАЦЭЎСКІ І. П. — дэкан эканамічнага факультэта.

ХАРЫТАНОВІЧ Ф. М. — загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.

ХАРЛАМАЎ І. Ф. — загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі.

ШАМЯТКОЎ Л. А.—прарэктар па вучэбнай рабоце.

ЭСМАНТОВІЧ І. Ф. — в. а. дацэнта кафедры гісторыі КПСС.

## ДЭЛЕГАТЫ НА XXII РАЁННУЮ ПАРТЫЙНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

АБРАМЕНКА М. Я. — студэнт 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

АКУЛІЧ М. У. — старшыня мясцкома.

АЛЯКСЕЕЎ-ХАІТ П. В. — старшыня рэвізійнай камісіі РК КПБ.

БЕРАЗОЎСКАЯ М. А. — нам. сакратара камітэта ЛКСМБ.

ГЕРАСІМАВА Ж. А. — нам. сакратара партбюро геалагічнага факультэта.

КІСЯЛЁВА Н. С. — сакратар партбюро біялагічнага факультэта.

КОЛТЫШАВА Н. І. — старшыня прафкома, член парткома.

КУРАЧЭНКА А. Д. — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі РК КПБ.

МАКСІМОВІЧ А. І. — сакратар партбюро эканамічнага факультэта.

МЯШЧЭРСКІ А. П. — загадчык кафедры гісторыі КПСС.

НЯРОНСКАЯ А. К. — сакратар партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта.

ПАЛЯКОЎ Л. Я. — сакратар партбюро матэматычнага факультэта.

СЕМЯНЧУК Я. А. — дацэнт кафедры гісторыі КПСС, член парткома.

ТРАФІМОВІЧ І. Р. — сакратар партбюро факультэта фізвыхавання.

ШАМЯТКОЎ Л. А. — прарэктар па вучэбнай рабоце, член парткома.

ШКОЛДЗІН У. М. — сакратар партбюро фізічнага факультэта.

ЭСМАНТОВІЧ І. Ф. — сакратар парткома.

## КАМІСІЯ ПРЫ ПАРТКОМЕ ПА КАНТРОЛЮ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ АДМІНІСТРАЦЫІ

БАЛАКІН В. А. — загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела.

КІМ С. А. — загадчык кафедры галіновых эканомік.

ЛЯВОНЧАНКА Д. А. — нам. дэкана гісторыка-філалагічнага факультэта.

МІЛЬЧАНКА Г. С. — выкладчык кафедры ГА.

СТАЎРОЎ В. П. — загадчык кафедры фізічнай метралогіі.

СЯМІКОП А. Ф. — загадчык кафедры тэарэтычных асноў фізвыхавання.

ТВАРДОЎСКІ М. І. — начальнік НДС.

ЯНКОВА Т. С. — дацэнт кафедры рускай мовы.

ХАРЫТАНОВІЧ Ф. М. — загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.

